Прамова тав. П. М. Машэрава

(Сакратар ЦК ЛКСМ Беларусі)

Таварышы! Гістарычныя рашэнні Пленумаў ЦК КПСС натхнілі комсамольцаў, моладзь на новыя патрыятычныя справы. Гэта знайшло сваё яркае выражэнне ў патрыятычным руху моладзі па асваенню цалінных і абложных зямель. Комсамольцы, моладзь Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюза, горача адгукнуліся на заклік партыі. Звыш 18 тысяч юнакоў і дзяўчат рэспублікі выказалі жаданне паехаць на асваенне новых зямель. Першыя групы добраахвотнікаў ужо выехалі ў раёны Казахстана.

Удзел у барацьбе за далейшае развіццё сельскай гаспадаркі з'яўляецца самай баявой задачай комсамола Беларусі. Усе намаганні комсамольскіх арганізацый накіроўваюцца ў сучасны момант перш за ўсё на прыцягненне комсамольцаў, моладзі да ўдзелу ў нарыхтоўцы і вывазцы на палі дастатковай колькасці мясцовых угнаенняў. Гэтая работа разглядаецца комсамолам рэспублікі як самая неадкладная справа ў барацьбе за павышэнне ўраджайнасці. На нарыхтоўцы і вывазцы ўгнаенняў занята зараз пераважная большасць калгаснай моладзі. Нарыхтавана і вывезена пад веснавую сяўбу ўжо больш як 14 мільёнаў тон торфу пры плане 16 мільёнаў тон.

Разам з тым трэба прызнаць, што комсамольскія органы рэспублікі многія важныя пытанні, звязаныя з удзелам комсамольцаў, моладзі ва ўздыме сельскай гаспадаркі, па-ранейшаму вырашаюць незадавальняюча. Мы дрэнна яшчэ падымаем моладзь на барацьбу за ўздым грамадскай жывёлагадоўлі. За час, які прайшоў пасля вераснёўскага Пленума ЦК КПСС, на работу ў жывёлагадоўлю накіравана ўсяго толькі каля 10 тысяч комсамольцаў. Слаба таксама вядзецца работа па арганізацыі спаборніцтва маладых жывёлаводаў за павышэнне прадукцыйнасці грамадскай жывёлы.

ЦК комсамола Беларусі ў апошні час прыняў рад мер да таго, каб узмацніць арганізатарскую работу ў комсамольскіх арганізацыях калгасаў, МТС і соўгасаў. Мы дабіліся некаторага скарачэння колькасці пасяджэнняў, прымаемых рашэнняў і г. д. Аднак гэта не дало яшчэ значных вынікаў.

Дэлегатамі з'езда было выказана нямала справядлівых папрокаў у адрас ЦК ВЛКСМ і яго апарату. Я хацеў-бы толькі падкрэсліць, што бюро і сакратары ЦК ВЛКСМ дапусцілі неаправальную марудnасць у перабудове работы апарату ЦК і ў вырашэнні раду пытанняў, якія паўсталі перад мясцовымі комсамольскімі арганізацыямі ў сувязі з рашэннямі вераснёўскага Пленума ЦК КПСС. Частыя пасяджэнні бюро ЦК ВЛКСМ, якія штодзённа прымаюць сакратарыят, якіх разгружаецца велізарная колькасць больш-менш выпадковых [illegible] пытанняў — усё гэта нас адцягвае ад бягучага кіраўніцтва работай комсамольскіх арганізацый. Нашы работнікі ЦК займаюцца падрыхтоўкай [illegible] пасяджэнняў, замест таго, каб больш часу праводзіць у сувязі з пастаўленымі вераснёўскім Пленумам ЦК КПСС пытаннямі. Не бываюць нашыя арганізацыйныя ўмацавання комсамольскіх арганізацый калгасаў і МТС.

ЦК ВЛКСМ, як і раней, у апошні час займае пазіцыю неўмяшання ў гэтую справу. У справаздачным дакладзе ЦК было ўказана, што ў комсамольскіх арганізацыях калгасаў краіны налічваецца 2 мільёны комсамольцаў—дзевятая частка ўсяго складу ВЛКСМ. Гэтая лічба сведчыць аб наяўнасці вялікай колькасці малалікіх комсамольскіх арганізацый у калгасах, якія іменна ў сілу сваёй малалікасці, арганізацыйнай слабасці не аказваюць належнага ўплыву на становішча спраў у калгасах. Пры гэтым трэба ўлічваць, што такія малалікія арганізацыі, як правіла, маюцца ў адстаючых калгасах, дзе комсамол павінен прыкласці найбольшыя намаганні. Аднак ЦК ВЛКСМ не аналізуе гэтых пытанняў, слаба займаецца ростам комсамольскіх радоў за лік калгаснай моладзі. Комсамольскія органы рэспублікі ўдзяляюць зараз асаблівую ўвагу павелічэнню комсамольскай праслойкі на сяле. Прымаюцца меры да актыўнага ўцягнення ў комсамол калгаснай моладзі, а таксама па накіраванню комсамольцаў з гарадоў і раённых цэнтраў для работы на вёсцы.

Мы бачым свой абавязак у тым, каб павысіць узровень кіраўніцтва палітычнай асветай і забяспечыць круты паварот усёй нашай прапагандысцкай работы да канкрэтных практычных задач, якія стаяць перад комсамольскімі арганізацыямі. Комсамольскім арганізацыям рэспублікі прадстаіць правесці вялікую работу па выкараненню сур'ёзных скажэнняў, дапушчаных у камплектаванні гурткоў і палітшкол. На гэтым пытанні трэба спыніцца больш падрабязна. У пагоні за найбольшым ахопам палітычнай вучобай многія камітэты комсамола шляхам адміністрацыйнага націску, не лічачыся з пажаданнем, узроўнем падрыхтоўкі юнакоў і дзяўчат, агульна залічвалі іх у гурткі і палітшколы. Аднак я не ведаю выпадку, каб ЦК ВЛКСМ і яго сакратар тав. Рапохін якія ўзначальвае ў ЦК участак ідэалагічнай работы, выступілі супраць такой практыкі. Наадварот. ЦК ВЛКСМ нярэдка ўсё сваё кіраўніцтва палітычнай асветай абмяжоўваў патрабаваннем максімальнага ахопу комсамольцаў, моладзі вучобай у гуртках і палітшколах.

ЦК ВЛКСМ слаба ўнікаў у змест работы гурткоў і палітшкол, не прымаў кольскі-небудзь сур'ёзных мер да павышэння ідэйнага ўзроўню заняткаў, а ў апошні час зусім перастаў цікавіцца палітычнай асветай, асабліва пасля таго, як паўстала пытанне аб скасаванні пачатковых палітгурткоў.

Таварышы! Комсамол Беларусі як адзін з баявых атрадаў ВЛКСМ будзе і надалей з гонарам выконваць свой свяшчэнны абавязак перад партыяй і сацыялістычнай Радзімай, падымаць сілы моладзі Савецкай Беларусі на самаадданую барацьбу за перамогу комунізма ў нашай краіне (Апладысменты).

(«Комсомольская правда» ад 24 сакавіка 1954 г.).

ПРЕЗИДЕНТСКАЯ БИБЛИОТЕКА РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ